**Мікалай Рудкоўскі**

# Усё, як вы жадалі (інфляцыя пачуццяў)

**Нехраналагічная камедыя у 2-х актах і 18-ці пераблытаных сцэнах.**

**Асобы:**

Бабулька
Воля
Толік
Афіцыянтка ў начным клубе
Вадзім Пятровіч
Карына
Стрыптызёр
Мама
Прадзюсер музыкаў
Музыкі (яны ж музыкі ў начным клубе)
Дзяўчынка
Хлопчык

*Па жаданню рэжысёра афіцыянтка, Вадзім Пятровіч, Карына, стрыптызёр, мама, прадзюсер музыкі, дзяўчынка і хлопчык могуць іграць і хатніх жывёл бабулькі.*

## АКТ I

### Сцэна 5

*Прыгожае пахаванне пад лёгкім, з вясёлкай, дажджом. Пахавальны аркестр складаецца з нефармальных маладых музыкаў. Гучыць прыемны лаўнж. Гламурная ўдава на магіле вытанчана здымае з нагі чорную падвязку. Жанчыны выстройваюцца за ёй. Удава кідае за спіну падвязку, усе жанчыны стараюцца яе спаймаць. Шчаслiўка радасна ёй махае.*

**Шчаслiўка.** Я наступная! Я наступная ўдава!

*Звоніць будзільнік. Пахавальная працэсія, спяшаючыся, уцякае. Толькі гламурная ўдава мітусіцца па сцэне.*

**Воля.** Ну і сон! Ну і сон! І трэба ж, каб такое прыснілася. Жах. Дурасць нейкая. І чорны колер мне аніяк не пасуе. Сёння ў клуб надзену белае. Час прачынацца. Час прачынацца. Бізнес-план. Бізнес-план. Чорны мне не пасуе. У 9 раніцы сустрэча. У 10.30 сустрэча. Які чорны? Белы. Толькі белы. Альбо чырвоны? У 12.45 дзелавы абед. Бізнес-план. Бізнес-план. Удава! Дурасць. Мне трэба адпачыць. Не, мне трэба сёння павіншаваць Вадзіма Пятровіча. У 17 гадзін брэйнсторм, брэйнсторм. І белае ў клуб. Чырвонае? Белае, толькі белае. Сіняе? Чорны колер такі змрочны. А белы такі бяскрыўдны. Вадзім Пятровіч. Вадзім Пятровіч. У чырвоным я буду больш эфектная. Усё! Прачынайся! Бізнес-план! Бізнес-план.

### Сцэна 9

*Шум цягніка. Бабулька каля магілы мужа.*

**Бабулька.** Прывітанне, любы. Прывітанне, мой дзядок. Як ты там? Сумуеш па мне? Сумуеш. А як ты сумуеш? Маўчыш. А я вось так сумую: аааа, ааааа. Ну, як? Спадабалася. Я старалася. А ў нашай козачкі дачка нарадзілася. Цудоўненькая дзяўчынка. Толькі капрызіць часта – рожкі рэжуцца. Маленькая, а бадацца хочацца. І кабылка наша ізноў кахання хоча. Толькі ажарабілася, а ўсё туды ж. Падбяжыць да каня і так палка капытом яго б’е, а ён яе ў адказ. А яна яго тады за грыву кусае і мутузіць, і мутузіць. Шалёныя. А кароўка

наша заляцела ўпершыню. Я думала, гордая трапілася. А потым і на яе пачуцці накацілі.

Бык карову пык,<br>а карова «Мык».<br>Дзякуй, дружа, бык.

Шляхетная такая стала. А цяпер пра галоўнае. Новую інфармацыю для нас знайшла. Слухай. *(Чытае газету).* «Самае цёплае і салёнае мора – Чырвонае. Плошча 450 тысяч квадратных метраў. Амывае Аравійскі паўвостраў і Афрыку. Чырвонае мора вельмі маладое. Яго фарміраванне пачалося каля 40 мільёнаў год таму назад, калі ў зямной кары з'явілася трэшчына». Гэта складана для нас. Вось яшчэ. «Галоўная асаблівасць мора ў тым, што ў яго не ўпадае ні адна рака, таму вада ў Чырвоным моры заўсёды крыштальна чыстая». Цяпер увага! «Тэмпература вады нават зімой не апускаецца ніжэй 20 градусаў. А яшчэ ў моры жывуць марскія каровы». Вось так. Іх называюць…дзюгоні. Так, дзюгоні. Амаль як коні. Яны ў поўдзень падплываюць пасвіцца на падводны лужок. «Яны вельмі добрыя і крыху меланхалічныя». І дэльфінчыкі там таксама ёсць… Што рабіць будзем? Маўчыш. Добра. У нас пакуль таксама цішыня. Ніхто так і не прыехаў. Толькі пазаўчора моладзь да нас тут панаехала. Тусоўкі, масоўкі. П'юць мала, кураць шмат. Музыкі. Іграюць шмат, як і кураць. Музыка незразумелая, але, ведаеш, неяк радуе. Учора ў горад збіралася за новымі паступленнямі, так я ў іх інфармацыю для нас папрасіла. Можа, сёння чаго падкінуць. У палатках жывуць за ракой. Да мяне за малаком і яйкамі прыходзяць. Грошай не бяру. У нас культурны бартэр. Можа, я дарма сабе ўсё прыдумала? Га? Але ж ты сам гэтага таксама хацеў. Я і трымаюся за нашыя дурныя, смешныя мары. Я буду шукаць і далей… Так. І на развітанне, як заўсёды, культурная праграма па заяўках. Праслухай песню з савецкага кінафільма. Назвы не памятаю, але песня добрая. Напэўна.

*Бабулька пачынае спяваць. Яе песня змешваецца з акордамі маладых музыкаў. Іх прадзюсер падыходзіць да бабулькі.*

**Прадзюсер.** Прывітанне пакаленню best.
**Бабулька.** Прывітанне пакаленню…
**Прадзюсер.** …next.
**Бабулька.** Next. Next. Кнігу прывезлі?
**Прадзюсер.** Усю не атрымалася. Але ў мясцовай бібліятэцы некалькі лісцікаў прыхапілі. На пару дзён вам хопіць, а потым можа яшчэ чаго прыхопім.

**Бабулька.** Добра.
**Прадзюсер.** Сёння бартэр адбудзецца?
**Бабулька.** Можна.
**Прадзюсер.** Нейкія асаблівыя заказы будуць?
**Бабулька.** Будуць. Мне б гэта… Як гэта…
**Прадзюсер.** Панк? Гранж? Фольк?
**Бабулька.** Таксама някепска. Але мне хочацца… класікі!
**Прадзюсер.** Рок?
**Бабулька.** Поўнай класікі.
**Прадзюсер.** Поўнай?
**Бабулька.** Зусім поўнай.
**Прадзюсер.** Песні ваенных часоў?
**Бабулька.** Ды што ты! Пабойся Бога! Нашмат раней.
**Прадзюсер.** Трыццатыя – дваццатыя?
**Бабулька.** Фу.
**Прадзюсер.** Дзевятнццатае?.. стагоддзе.
**Бабулька.** Хаця б.
**Прадзюсер.** Ой, не. Мы не зможам.
**Бабулька**. Няўдачнікі.
**Прадзюсер.** Чакайце, чакайце. Можа нешта прыдумаем?
**Бабулька.** Наступным разам у бібліятэцы ноты гэтаксама прыхапіце.
**Прадзюсер.** А каго хоць трэба сцягнуць?
**Бабулька** (*зыходзячы*). Паспрабуйце Адольфа Адана.

**Прадзюсер.** Каго? Ё маё. Адольф - я яшчэ запомню. Адольф Гітлер. А вось Адана. Адан, Адан, адын, зусім адын… Гітлер адзін. Зусім адзін. Гітлер застаўся адзін. Гітлер Адольф. Адзін – Адан. Адзін Гітлер – адзін Адан. Шайтан! О! Ева Браун. Гітлер узяў прозвішча Евы. Адольф Браун. Адольф Адан. Крута. Адольф Браун – Адольф Адан.

*Шум цягніка.*

## Сцэна 1

**Хлопчык**. Я цябе не кахаю.
**Дзяўчынка**. Вельмі трэба.
**Хлопчык**. Я зусім цябе не кахаю.
**Дзяўчынка**. А вусны дрыжаць.
**Хлопчык**. Не.
**Дзяўчынка**. Так.
**Хлопчык**. Дула.

**Дзяўчынка**. Што яшчэ за «дула»?
**Хлопчык**. Не дула, а дула.
**Дзяўчынка**. Я цябе не разумею.
**Хлопчык**. А я цябе не кахаю.
**Дзяўчынка**. Ды што ты разумееш у каханні?
**Хлопчык**. Усё.
**Дзяўчынка**. Што ўсё?
**Хлопчык**. Усё - усё.
**Дзяўчынка**. Напрыклад?
**Хлопчык**. Не скажу.
**Дзяўчынка**. Таму што не ведаеш.
**Хлопчык**. А што ты ведаеш?
**Дзяўчынка**. Я ведаю, калі мяне Лёша крыўдзіць, альбо калі Косця дражніцца – мне ўсё роўна. А калі ты мяне дурай называеш, мне балюча.
**Хлопчык**. Добла, не дула.
**Дзяўчынка**. У цябе майка вельмі прыгожая…

## Сцэна 10

*Шум цягніка. Бабулька каля магілы.*

**Бабулька.** «Пакольki Арафурскае мора з'яўляецца мелкаводным …». Нос свярбіць. Да чаго б гэта? «…з'яўляецца мелкаводным трапічным морам, у яго водах часта ўтвараюцца трапічныя тайфуны». Абы што. «Мора Банда». Цікавая назва. Інфармацыі нуль. «Флорэс, Сулавесі… Ураганы… Вільготнасць…Трапічныя дажджы…». Памятаеш? Пасля вяселля ўвесь тыдзень ішоў дождж. Мы нічога не маглі рабіць, толькі кахаць адно аднаго і час ад часу глядзелі ў вакно, назіралі за тым, як цяжкія мокрыя яблыні прагнулі кахання на зямлі. І нахіляліся, нахіляліся… Гэта быў самы лепшы ў маім жыцці нетрапічны дождж… Нос свярбіць. Добра, мой дэвіз – жыццё без дажджу. Будзем шукаць далей. І, як заўсёды ў гэты час, культурная праграма. Крыху паэзіі. Паслухай вершы… (*Гукі машыны, якая заблудзіла).* Загадвай жаданне**.** Калі гэта жанчына – вечар сапсаваны. Калі мужчыны – мора не будзе. Калі муж і жонка – адчуваю, нап'ёмся. *(Чакае машыны).* О! Усё. Нап'ёмся. Носам чую нап'ёмся.
**Воля.** Куда ты мяне прыцягнуў? Ты думаеш сваёй галавой калі-небудзь ці не?

**Толік**. Адкуль я ведаў, што тут дарогі няма? Сама б за руль села і… не якацела.
**Воля.** Дурня кавалак.
**Толік.** Цішэй. Ты можаш цішэй гаварыць?
**Воля.** А каго мне тут саромецца?
**Толік.** Цішэй, калі ласка.
**Воля.** Не.
**Толік.** Прашу цябе, замоўкні.
**Воля.** Сам замоўкні!
**Бабулька.** Лаюцца. Добра. Так прыемна слухаць. Мой нябожчык муж у маладосці таксама любіў мяне лаяць. Я зраблю што-небудзь гэтакае, а ён на мяне «дурніца ты», «карова», «кабыла дурная». Як прыгожа крычаў. А я ад яго словаў уся так і млела. Стаю, усміхаюся, а ён тады сякеру ў бок кіне і за мной бяжыць, каб адлупцаваць. Я віскачу, уцякаю, а ён мяне дагоніць, на зямлю заваліць і ўсё мне даруе. Якую б дурасць я не ўчыніла. А вы таксама дурная?
**Воля.** Вельмі дурная, калі гэтаму прыдурку паверыла.
**Толік.** Памяняй свой бруд на думкі.
**Воля.** Якія словы! Памяняю, калі ты замоўкнеш.
**Толік.** Сама замоўкнеш?
**Воля.** Сам замоўкні!
**Толік.** Ты замоўкні!
**Воля.** Замоўкні!

*Шум цягніка.*

**Толік** *(дастае метр).* Трымай! Мерай! Шэсць восемьдзесят.
**Бабулька.** Яшчэ. Яшчэ! Палайцеся, а я вам пазайздрошчу.
**Воля.** Колькі?
**Толік.** Шэсць восемьдзесят.
**Бабулька.** Вы добра лаецеся. Добра.
**Воля.** Да нічога добрага. Ні ў лаянцы, ні ў вашым доме.
**Бабулька.** Як нічога добрага?
**Воля.** Колькі?
**Толік.** Шэсть дзевяноста.
**Воля**. Гм. Шэсць дзевяноста.
**Бабулька.** Ды паглядзіце лепш.
**Воля.** Бачыла ўжо. Плот стары… Ад ветру ажно хістаецца…
**Бабулька.** Не ад ветру хістаецца.
**Толік.** Ад чаго тады?
**Бабулька.** Ад нашага кахання, як маладымі з маім чалавекам былі.

**Толік.** Ого.
**Бабулька.** Вось і я кажу «ого». Вы на плоце спрабавалі?
**Воля.** Што? Ды вы што, бабуля?
**Бабулька.** Я нічога. А вы і сапраўды дурніца.
**Воля.** Клас! Прыехала домік паглядзець, каб затым купіць. І што я бачу? Што я чую? Лаянку ў мой бок, расхістаныя ад кахання платы, узбуджаныя кусты па самае…
**Толік.** Ого-го-го.
**Воля.** … па самае "ого-го"! Разбураныя адрыны…
**Бабулька.** Адчайныя адрыны. Там сенавал і да гэтага часу.
**Воля.** На сенавале я таксама не спрабавала.
**Толік.** Бо дурная.
**Воля.** Дзякуй. А ты, я бачу, разумны. Ужо спрабаваў?
**Толік.** Як першы раз на бульбу ездзіў.
**Воля.** А на рыбалцы не спрабаваў?
**Толік.** На рыбалцы мы рыбу ловім!
**Воля.** Гэта дурні ловяць, а ты разумны. Не ведаю ўжо, якую ты там асалоду здабываеш са сваімі разумнымі сябрамі.
**Толік.** Хопіць!
**Воля.** Сенавальшчык хрэнаў!

*Шум цягніка.*

**Бабулька.** А вы паспрабуйце. Няма нічога лепей, за прапахлае сухой травой знямоганае цела…
**Воля.** Ведаеце, бабуля, нам гэта не вельмі прыемна слухаць. Мы на некалькі хвілін заехалі, хатку вашу паглядзелі…
**Бабулька**. А чаму толькі на некалькі хвілін? Заставайцеся на ўсе выхадныя.
**Воля.** Я не хачу ў гэтым куратніку жыць.
**Бабулька.** Не, вы не зразумелі. Куратнік перад сенавалам стаіць, а гэта мой дом. Вось тут спальня. У ёй і адпачнеце.
**Воля.** Гэта спальня?
**Бабулька.** Так.
**Толік.** Метр восемьдзесят.
**Воля.** Дзякуй.
**Толік.** А чаго? Нам падыходзіць.
**Воля** *(перадражнівае)***.** А чаго! Нам падыходзіць! Ты на ложак паглядзі. Як у народных казках.
**Бабулька.** Лепей, лепей, чым у казках. Мяккі, пухнаты, прасторны. Тут наша каханне пачалося, тут і скончылася. (*Пяе*).

Сведчылі месяц, ноч і я,
Сцелюць пасцель рукі жаночыя,
Рукі белыя, рукі ўмелыя,
Як яны знаюць справу сваю,
Узлятаюць падушкамі белымі…

Гэты ложак увесь набрыняў нашай жарсцю, ад драўляных ножак і да матраца.

**Воля.** Я ўяўляю!
**Толік.** Няўжо? Ты можаш уяўляць?
**Воля.** Меньш рыбу лавіць трэба.
**Толік.** Ты ж са мной не хочаш.
**Воля.** А ты хіба ўмееш?
**Толік.** Яшчэ ні адна рыбанька не скардзілася.
**Воля.** Скаціна.

*Шум цягніка.*

### Сцэна 3

**Дзяўчынка**. Я не хачу рабіць урокі.
**Мама.** Чаму?
**Дзяўчынка**. Не хачу. Мне кепска.
**Мама.** Галава баліць?
**Дзяўчынка**. Горш.
**Мама.** Жывот?
**Дзяўчынка**. Горш.
**Мама.** Што, дзетачка?
**Дзяўчынка**. Душа.
**Мама.** Тады гэта, вядома, сур'ёзна. Якія ў цябе праблемы?
**Дзяўчынка**. Адзін хлопчык…
**Мама.** Я так і думала.
**Дзяўчынка**. Не перапыняй.
**Мама.** Прабач.
**Дзяўчынка**. Адзін хлопчык носіць кожны дзень адну майку.
**Мама.** Нямыцька.
**Дзяўчынка**. Не. Проста я сказала яму, што ў яго майка прыгожая. Вось ён яе і не здымае.
**Мама.** Гэта вельмі сур'ёзна.
**Дзяўчынка**. Я вінаватая, праўда?
**Мама.** Гэта не віна, гэта ўжо пачуцці.

**Дзяўчынка**. Значыць, я падабаюся яму?
**Мама.** Падобна на тое.
**Дзяўчынка**. А чаму тады ён дражніцца?
**Мама.** Мужчыны ўсе такія.
**Дзяўчынка**. Ён яшчэ хлопчык.
**Мама.** Яны з дзяцінства такія.
**Дзяўчынка**. Грубыя?
**Мама.** Так, грубыя і кепска разумеюць жаночую душу.
**Дзяўчынка**. Дык мне пакрыўдзіцца на яго?
**Мама.** Не трэба. Гэта ласкавыя словы ў іх такія. Вось, калі стаеш дарослай, ты зразумееш, як гэта соладка. А вось калі цябе муж будзе «зайчыкам, рыбанькай» называць, значыць, штосьці тут ужо не так. Можа нават, ён цябе ўжо і не кахае.
**Дзяўчынка**. Добра, хай сабе лаецца.
**Мама.** Ты ўжо патрывай крыху.
**Дзяўчынка**. Крыху патрываю.
**Мама.** І, калі ласка, запытай у яго наступным разам: «Можа, у цябе іншыя прыгожыя майкі ёсць?».
**Дзяўчынка**. Так і быць. Запытаю.

**Сцэна 13**

*Шум цягніка.*

**Прадзюсер.** Знайшоў! Знайшоў!
**Бабулька.** Што ты знайшоў?
**Прадзюсер.** Адольфа Адана! Нарадзіўся ў 1803 годзе ў Парыжы! Скончыў кансерваторыю, напісаў сорак опер!
**Бабулька.** Ды не крычы ты.
**Прадзюсер.** Адкрыў свой тэатр «Нацыянальная опера»…
**Бабулька.** Чаго крычыш?
**Прадзюсер.** Ну, вось так. «Жызэль» падыйдзе?
**Бабулька.** Так.
**Прадзюсер.** Ноты ёсць. Вось некалькі лістоў.
**Бабулька.** Некалькі?
**Прадзюсер.** Затое з лібрэта. Будзеце ведаць змест балета.
**Бабулька.** Вярні на радзіму. О! Крэатыўна ўсё зрабілі.
**Прадзюсер.** Тэнк ю.
**Бабулька.** З бартэрам усё будзе як мае быць, не хвалюйся. Толькі да світання культурная праграма павінна быць гатова.

**Прадзюсер.** Да світання?
**Бабулька.** Так. Таму ноч не спаць, цінэйджэры.
**Прадзюсер.** А мы і так не спім. Можа, у вас сэм ёсць?
**Бабулька.** Хто?
**Прадзюсер.** Сэм. Самагон. Для рэпы.
**Бабулька.** Якой рэпы?
**Прадзюсер.** Ну, рэпы. Рэпетыцыі. Нам трэба завесціся мацней і не спаць.
**Бабулька.** Зразумела.
**Прадзюсер.** Дык ёсць?
**Бабулька.** Што?
**Прадзюсер.** Самагон.
**Бабулька.** Ёсць, ёсць.
**Прадзюсер.** Дык зараз дадзіце па бартэру?
**Бабулька.** Дам, дам адну бутэльку.
**Прадзюсер.** Мала.
**Бабулька.** Пракурор дадасць.
**Прадзюсер.** Ён дадасць, а можа, і вы яшчэ паўбутэлечкі для кампрэса. Горла баліць.
**Бабулька.** Я ж не спяваць цябе прашу, а іграць.
**Прадзюсер.** Я не пяю і не іграю, я – прадзюсер нашай банды. Я кантралюю працэс. А раптам захварэю і злягу? Да світання паспець трэба…
**Бабулька.** Добра. Сустрэнемся пасля першага крыка пеўня на магіле.
**Прадзюсер.** На магіле?!
**Бабуля.** Ну што ты як хлопчык? Магіла – адна, а нас – цэлая банда.
**Прадзюсер.** На магіле, дык на магіле.
**Бабулька.** Галоўнае, не ніжэй.
**Прадзюсер.** А вы мне падабаецеся.
**Бабулька.** Ты не вычварэнец?
**Прадзюсер.** Я добры.
**Старушка.** Чаго?
**Прадзюсер.** Нармальны.
**Бабулька.** Добра, жыві, менеджэр.
**Прадзюсер.** Усё будзе чыкі-пыкі.
**Бабулька.** Пойдзем за сэмам. Толькі не крычы. У мяне важныя госці.
**Прадзюсер.** Магіла.

## Сцэна 6

*Начны клуб. Граюць музыкі. Воля і Вадзім Пятровіч танцуюць.*

**Вадзім Пятровіч**. Гэта мой любімы клуб. Тут заўсёды ціха, спакойна. Вас штосьці, Волечка, бянтэжыць?
**Воля.** Мая адзінокая прысутнасць. У такога чалавека, як вы, на дні нараджэння павінна быць шмат гасцей, а не адна маладая замужняя жанчына.
**Вадзім Пятровіч**. У такога чалавека, як я, павінен быць такі капрыз. Вы захацелі ўліцца ў мяне, гэта значыць у маю кампанію. Вось і ўлівайцеся адна. Я мора, вы рака. Нашто нам іншыя рэкі?
**Воля.** Каб мора не перасохла.
**Вадзім Пятровіч.** Яшчэ віна?
**Воля.** Крыху. Я павінна вярнуцца да мужа ў дзелавой кандыцыі.
**Вадзім Пятровіч.** Нават дзелавыя дзяўчыны дзеля справы часам павінны забываць пра сваю замужнюю кандыцыю.

*Падыходзяць да століка. П'юць віно. На танцпляцоўцы выступае стрыптызёр.*

**Вадзім Пятровіч.** Вы заўсёды верная сваёй справе?
**Воля.** Толькі ў снах.
**Вадзім Пятровіч.** Я пра мужа.
**Воля.** І я пра мужа.
**Вадзім Пятровіч.** І з кім у сне?
**Воля.** Адна.
**Вадзім Пятровіч.** Вытанчана!
**Воля.** Застаюся ў сне адна.
**Вадзім Пятровіч.** Страшная доля сучасных бізнес-лэдзі.
**Воля.** За ваша здароўе, Вадзім Пятровіч. За тое, каб вы ніколі не зведалі гэтай страшнай жаночай долі.
**Вадзім Пятровіч.** Не, трэці тост за каханне. Вып'ем сардэчную левай рукой. Глядзіце мне ў вочы. За каханне!

*У клубе з'яўляюцца Толік і Карына. Ідуць да бара.*

**Вадзім Пятровіч.** Я не хачу вас спакусіць, Воля. Я хачу, каб наш бізнес квітнеў. І хачу, каб мы сталі сябрамі.
**Воля.** Я таксама гэтага хачу.
**Вадзім Пятровіч.** Тады нам давядзецца выпіць на брудэршафт.

**Воля.** Я не вельмі гэтага хачу.
**Вадзім Пятровіч**. Што такое?
**Воля.** Як гэта? Не крыўдуйце, але гэта не гігіенічна.
**Вадзім Пятровіч.** Сяброўства не можа быць негігіенічным. Калі мы станем сябрамі, то ў нас павінны быць адны і тыя ж хваробы, а віно, каханне і любоў забіваюць мікробы.
**Воля.** Добра. За наша сяброўства!

*Выпіваюць, цалуюцца. Воля і Толік заўважаюць адзін аднаго.*

**Воля.** Бля-я-я-яха!..
**Вадзім Пятровіч.** Што? Гідка?
**Воля.** Я заляцела!
**Вадзім Пятровіч.** У сэнсе?
**Воля.** Муж тут.
**Толік.** Ні фіга сабе карпаратыўныўная вечарыначка! І што ж тут адбываецца?
**Воля.** Жахі тут адбываюцца.
**Толік.** Садом і Гамора!
**Воля.** Гэта дзелавы дзень нараджэння!
**Толік.** Хараша прыдумала! Хто ж вы, дзядзечка?
**Вадзім Пятровіч.** Я вам не дзядзечка.
**Воля.** Гэта і ёсць Вадзім Пятровіч.
**Толік.** Усцацца мне ад радасці!
**Стрыптызёр.** Не крычыце, я працую.

*Набліжаецца афіцыянтка.*

**Воля.** Што ты гаворыш? Гэта быў бяскрыўдны сяброўскі пацалунак.
**Толік.** Бяскрыўдны? Сяброўскі? Ах, дзядзечка Вадзім! Дай я цябе пацалую!
**Вадзім Пятровіч.** Хопіць!
**Воля.** Кінь ужо!
**Толік.** Я так, дзядзечка Вадзім, цябе даўно не бачыў! Я ссумаваўся ўвесь па тваіх бяскрыўдных пацалунках! Запрасі мяне на белы танец!
**Афіцыянтка.** Гарачую страву несці?
**Вадзім Пятровіч.** Малады чалавек…
**Воля.** Толік!
**Толік.** Пацалуеш мяне, дзядзечка? Чаго адварочваешся?
**Вадзім Пятровіч.** Я не цалуюся з хлапцамі!
**Толік.** А з чужымі жонкамі, глыбока засунуўшы язык у рот?!

**Стрыптызёр.** Дайце мне працаваць!
**Вадзім Пятровіч.** Малады чалавек, кіньце…
**Афіцыянтка.** Яшчэ раз пытаю, гарачую страву ўжо несці?
**Толік.** Ідзі да мяне, у мае абдымкі!
**Воля.** Толік! Спыніся!
**Толік.** Не спынюся!
**Карына.** Толік, што тут адбываецца?
**Толік.** Мудня тут вялікая адбываецца
**Воля.** А гэта хто?
**Толік.** Карына!
**Воля.** Стоп! А чаму ты не на рыбалцы?
**Толік.** Рыбка не ловіцца!
**Воля.** Што гэта за каза?
**Карына.** Я не каза.
**Афіцыянтка.** Я не зразумела, гарачую страву несці?
**Стрыптызёр.** Вы мне замінаеце! Я хачу нармальна працаваць!
**Воля.** Што гэта за каза, пытаю?
**Карына.** Я не каза. Я Карына.
**Вадзім Пятровіч.** Волечка, не трэба!
**Толік.** Ах, Волечка! Ужо Волечка? А чаму я не ведаю, што ты для дзядзечкі цяпер Волечка?
**Воля.** А чаму я не ведаю, што ты рыбку лавіць цяпер у клуб ходзіш з дурной казой?!
**Афіцыянтка.** Так, толькі не крычыце.
**Карына.** Я не дурная.
**Стрыптызёр.** Дайце мне спакойна пад музыку распрануцца!
**Воля.** Яна дурная! Хочаш, паспрачаемся?
**Толік.** Чаму ён цябе назваў Волечкай?
**Воля.** Гэта бізнэс!
**Толік.** Знайшла дурненькага Янаčку!
**Воля.** А дзе твая вудачка?
**Толік.** Дома ляжыць! Адмянілася рыбалка! У Сяргея рамонт!
**Стрыптызёр.** Я не чую музыкі з-за вас!
**Толік.** Мы мэблю цягалі!
**Афіцыянтка.** Не крычыце вы ўсе! У мяне вушы хворыя!
**Толік.** А старую выкідалі! У Сяргея начная сёння! Мы з Карынай канапу на звалку вынеслі і палілі яе!
**Воля.** Ах, палілі ўдвух канапу!
**Толік.** Так, палілі!
**Воля.** Чаго ж мяне не паклікалі? Я б зрабіла выдатныя здымкі рыбака і казы на фоне пажара!

**Карына.** Я не каза.
**Воля.** А нашто ты паліў канапу?
**Толік.** Так трэба было!
**Стрыптызёр.** Я выпадаю з такта!
**Толік.** Каб сагрэцца!
**Афіцыянтка.** Не крычыце. Вушы заклала.
**Воля.** Сагрэлася, каза?
**Карына.** Я не каза. Я жонка Сярожы. Ён дазволіў.
**Воля** *(перадражнівае).* Што дазволіў? Канапу паліць?
**Толік.** У клуб схадзіць!
**Воля.** А перад клубом на канапе спапялялі адно аднаго, каб пасля сляды злачынства спаліць?!
**Толік.** Проста пажартавалі! Як ля вогнішча!
**Воля.** Скнара! Мог бы канапу вулічнікам-геям падарыць! Ім было б мякчэй вывучаць свае задубелыя эрагеныя зоны!
**Вадзім Пятровіч**. Жах які!
**Толік.** Фу! Які жах! Мая жонка шкадуе вулічнікаў, геяў і старых казлоў па бізнесу!
**Вадзім Пятровіч.** Я не казёл...
**Карына.** Я Карына.
**Воля.** Мярзотнік!
**Афіцыянтка.** Вушы! Сволачы!
**Толік.** Істэрычка!
**Афіцыянтка.** Вушы! Вушы!
**Воля.** А ты... дзяцел шалёны!
**Стрыптызёр.** Ды пайшлі вы ўсе!
**Толік.** Што?
**Афіцыянтка.** Стрыптык, хоць ты замоўкні!
**Толік.** Хто я?
**Воля.** Дзяцел шалёны! Мармазяўр!
**Стрыптызёр.** Я таксама чуллівы і трапяткі!
**Афіцыянтка.** Вушы баляць! Сволачы!
**Толік.** Выдра!
**Стрыптызёр.** Я не магу так працаваць! *(Зыходзіць).*
**Воля.** Я выдра?
**Афіцыянтка.** Сволачы! Я нярвовая!
**Карына.** Я хачу пайсці.
**Толік** *(Карыне).* Не! *(Вользе).* Так, мы палілі канапу! Уяўляеш? Канапу! Яна дымілася як ранішні туман над ракой, а потым так ярка запалілася, як наш мядовы месяц! Уяўляеш?!
**Воля.** Не ўяўляю!

**Карына.** Я хачу дамоў!
**Афіцыянтка.** Не крычаць! Бо калі я пачну крычаць, то будзе ўсім гамон!
**Толік** *(Карыне).* Нікуды ты не пойдзеш!
**Воля** *(Толіку).* А ты не камандуй!
**Карына.** Чаму?
**Воля** *(Карыне).* А ты не слухай гэту дурніцу!
**Карына.** Гэта ж мужчына.
**Воля.** А мне ўсё роўна!
**Вадзім Пятровіч.** Жах!
**Афіцыянтка.** Ціха! Усім ціха! На мяне ўсім глядзець! (*Усе маўчаць).* Я незвычайна стройная, невымоўна прыгожая, фенаменальна разумная, бясконца добрая, бязмежна працаздольная, надзвычай таленавітая, гіперсэксуальная, не па гадах развітая, нечакана нечаканая, неверагодна перспектыўная, неспасцігальна аптымістычная, вельмі-вельмі-вельмі інтэлігентная, неапісальна пачуццёвая і фантастычна сціплая. Амаль бландынка. Толькі вушы хворыя.
**Вадзім Пятровіч.** Вам праца не патрэбна?
**Афіцыянтка.** Скажу адразу: адпачынка хачу трыццаць пяць дзён, палова ў жніўні, палова на Новы год, у нядзелю не выклікаць, у суботу можна раз у месяц, але толькі з прэзерватывам, заўсёды спазняюся на гадзіну, не працую раней дзесяці ранку, праз два - тры гады хачу пайсці ў дэкрэт...
**Вадзім Пятровіч.** Мне б самаму такую працу.
**Афіцыянтка.** Вазьміце тады замуж.
**Вадзім Пятровіч.** Я з Кемерава. *(Зыходзіць).*
**Воля.** Вадзім Пятровіч!
**Толік** *(перадражнівае).* Вадзім Пятровіч!
**Афіцыянтка.** Во, халера ясная, якая прыкрасць.
**Воля.** З Кемерава?

*Вяртаецца стрыптызёр.*

**Толік.** Добра так адпачылі.
**Воля.** Гламурна пакрычалі.
**Стрыптызёр.** Прабачце. Вы не знаходзілі мае стрынгі?

*Заслона.*

## АКТ II

### Сцэна 11

**Бабулька.** Ну што? Закурым?
**Толік.** Я не куру.
**Бабулька.** Я таксама.
**Толік.** Значыць, справа да мяне ёсць?
**Бабулька.** Ёсць.
**Толік.** Ну?
**Бабулька.** «Ну» у люстэрцы пабачыш.
**Толік.** Давайце абражаць мяне не будзем…
**Бабулька.** А з пачуццём гумара ў нас як? У горадзе з гэтым кепска?
**Толік.** Так, кепска. Часам адключаюць разам з гарачай вадой.
**Бабулька.** Бойлер купіць спрабавалі?
**Толік.** Спрабавалі. Ня грэе.
**Бабулька.** А што ты хочаш у гэтым жыцці?
**Толік.** Не ведаю.
**Бабулька.** Гэта не адказ.
**Толік.** Чаму?
**Бабулька.** У дзяцінстве ты ведаў, чаго хацеў?
**Толік.** Ведаў.
**Бабулька.** У школе ведаў?
**Толік.** Ведаў.
**Бабулька.** А што з намі зараз здарылася?
**Толік.** Сапраўды, штосьці здарылася… Як быццам злая ведзьма з ЖЭСа перакрыла мне кран, і мае пачуцці цяпер стынуць на халодных трубах, а высахнуць не могуць.
**Бабулька.** Дык чаго ты хочаш? Падумай, напружся.
**Толік.** Хачу гармоніі.
**Бабулька.** Малайчынка.
**Толік.** Але дзе яна?
**Бабулька.** Яе дамагацца трэба. Вось і пастарайцеся ўдвух.
**Толік.** І чаму вам не дваццаць пяць год? І чаму вы не мая жонка?
**Бабулька.** Таму што іншая мама для цябе ягадку вырасціла.
**Толік.** Такую кіслую?
**Бабулька.** Ягадкі розныя бываюць. Можа, тваёй сонца не хапіла, а можа, палівалі бяз меры.
**Толік.** А можа, цукру мала дадаваў?
**Бабулька.** А можа, перасаладзіў? Для кожнай ягадкі свой спосаб прыгатавання патрэбен. І твая кіслая раней жа салодкай была?

**Толік.** Была. І якой смачнай!
**Бабулька.** Вось бачыш! Давядзі сваю ягадку да кіпення альбо патаўчы як мае быць у ступе.
**Толік.** Складаныя спосабы.
**Бабулька.** Любіш смачна есці – любі і аблізвацца! А твая на сенавал пайшла.
**Толік.** Ды вы што?
**Бабулька.** Так-так.
**Толік.** Дагнаць?
**Бабулька.** Ні ў якім разе. Хай сама разбярэцца, што там да чаго. А ты дапамажы ёй пасля, радражні, і яна сама цябе на сена зацягне.
**Толік.** Гэта з серыі «Нам бы так хацелася».
**Бабулька.** Калі моцна захацець, усё атрымаецца. Зразумеў?
**Толік.** Так.
**Бабулька.** Што ты як у першым класе? «Так». Не можаш поўным сказам адказаць? Дык зразумеў ты мяне?
**Толік.** Так, зразумеў, калі моцна захацець, усё атрымаецца.
**Бабулька.** Вось, газетку пачытай, прыкінься абыякавым, а потым зрабі так, каб твая Воля ажно закіпела, а я табе падыграю. Ну як?
**Толік.** Добра.
**Бабулька.** Я ж кажу, што ты малайчынка.

## Сцэна 7

*Начны клуб. З аднаго боку Воля за столікам дапівае віно. Каля століка стрыптызёр у такт маруднай музыцы гайдае бёдрамі. З другога боку Толік за барнай стойкай п’е гарэлку. Афіцыянтка, заціснуўшы рукой адно вуха, слухае яго.*

**Толік.** У дзяцінстве я любіў глядзець індыйскія фільмы…
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Ой, не магу! Індыйскія фільмы!
**Толік.** Чаго смяешся? Так, любіў. Яны яркія. Там плачуць і смяюцца. І я ў зале то плакаў, то смяяўся.
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Я зараз заплачу ад смеха!
**Стрыптызёр.** Можа, хопіць ужо?
**Воля.** Танцуй, пакуль халасты, хлопец. Танцуй, пакуль халасты.
**Толік.** І гучала такая незразумелая музыка, якая кудысьці за сабой вяла. Па чакры так незразумела гучала і вяла…
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Па чакры!

**Толік.** А вяла яна ў самыя глыбіні позірку індыйскіх жанчын. Яны таксама незразумелыя. Сядуць і на віне іграюць.
**Афіцыянтка.** На віне?
**Толік.** На віне і на сітары. Хто на чым можа.
**Афіцыянтка.** Ой, мама, не магу. На сітары!
**Стрыптызёр.** Ну, здаецца, усё.
**Воля.** Танцуй!
**Стрыптызёр.** Ага. Сапсуюць настрой, а пасля «танцуй». Калі ўжо гэты працоўны тыдзень скончыцца?
**Воля.** Паслязаўтра.
**Толік.** Індускі вельмі пластычныя ў танцы. І вельмі пластычныя ў адносінах. Вельмі. Пластыка – гэта рэч! Яны лёгкія ў адносінах. Усё разумеюць, усё даруюць. Нічога не гавораць. Вось толькі ціку на лоб паставяць і…
**Афіцыянтка.** Чаго?
**Толік.** Ціку. Ну, ціка – чырвоная кропка.
**Афіцыянтка** (*смяецца).* Ціка! Ой, зараз памру… Ну і весялун жа ты!
**Толік.** Ды не весялун я. Мне не да смеху. Я не буду казаць, што мне кепска. А мне кепска. Але далей будзе ўсё добра. Але сёння вельмі кепска, як у першай серыі. А ў канцы скончыцца ўсё добра.
**Афіцыянтка.** Як у індыйскім кіно.
**Толік.** Так! А ты ведала, што індыйскія жанчыны самыя верныя?
**Афіцыянтка.** Значыцца, я таксама індыйская жанчына?
**Толік** Не! У цябе чакра смешная.
**Афіцыянтка** *(смяецца).* І цікі няма!
**Толік.** І на віне ты ня граеш!
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Ня граю! І на сітары таксама!
**Стрыптызёр.** І што? Я так да пенсіі танцаваць буду?
**Воля.** Танцуй. За ўсё заплачана дзядзькам з Кемерава. Чаму з Кемерава?
**Стрыптызёр.** Я не народны артыст, каб паміраць на сцэне…
**Воля.** Вазьмі бальнічны.
**Стрыптызёр**. Я не дажыву да бальнічнага.
**Воля.** Чаму вы такія слабыя? Вось я ў дзяцінстве любіла глядзець японскія фільмы…
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Ой, мама, ляснулася мая чакра!
**Воля.** Мяне здзіўлялі японскія акцёры. Марудная, годная хада. Няспешны рух і жэсты. Як каты: сядзяць, глядзяць. Ураганы, мухі, здрады, мышы – усё няважна. А потым кароткая маланка ў вачах, і ўсе ўжо мёртвыя. Адна я ў цёмнай зале ў поўнай знямозе. А ён, гад, ізноў сядзіць і спакойна рыс есць. *(Ачомалася).* Ты хто?

**Стрыптызёр.** Я з Кемерава. Патанцуем?
**Воля.** Я паглядзела шмат японскіх фільмаў. А самураі ўсё сядзелі і сядзелі, рыс свой елі і елі, сакэ пілі і пілі... У выніку я сама стала японскай актрысай. І мне не шкада. Я буду танцаваць адна! Ты вольны. *(Танцуе).* Я вялікая індыйская актрыса! Альбо японская? Без сакэ не разбярэшся. Спадарыня!
**Афіцыянтка.** Уважліва вас слухаю.
**Воля.** Сакэ ёсць?
**Афіцыянтка** *(смяецца).* Сакэ! Што гэта?
**Воля.** Цёплая японская гарэлка.
**Афіцыянтка.** Японской няма. Ёсць наша. Магу падагрэць.
**Воля.** Грэй!
**Афіцыянтка.** Прабачце. Да кіпню даводзіць?
**Воля.** Не трэба.
**Афіцыянтка.** Зразумела. *(Зыходзіць).*
**Толік.** Вось так заўсёды: як усё добра, дык адразу ж усё і кепска.
**Воля.** Хочацца танцаваць і плакаць.
**Толік.** Хочацца плакаць і піць.
**Воля.** А рыбкі плачуць, калі іх разлучаюць на ўсходзе сонца рыбакі?
**Толік.** Не плачуць. Трытончыкі плачуць.
**Воля.** Трытончыкі? Плачуць?
**Толік.** Плачуць. Ім рыбак шкада.
**Воля.** Якое гора...
**Толік.** А я не плачу.
**Воля.** Мне б твае жабры.
**Толік.** А ты паспрабуй нырнуць глыбей.

*Вяртаецца афіцыянтка.*

**Воля.** А ты нырнеш за мной?
**Толік.** Нырну.
**Воля.** Толькі не патані, трытончык, у сваім суме.
**Толік.** Кінеш выратоўчы круг у апошні момант?
**Воля.** Я кепска чую ў апошні раз.
**Афіцыянтка.** Што-небудзь яшчэ?
**Воля.** Ужо нічога. *(П'е).*
**Афіцыянтка.** Гэта карма. *(Зыходзіць).*
**Толік.** Давай вып'ем міравую.
**Воля.** Я не п'ю і да п'яніц стаўлюся з пагардай...
**Толік.** А што нам, кабанам?

**Воля.** Няўжо ты не разумееш, што цяпер кожная твая мара пра рыбалку будзе выклікаць у мяне жах?
**Толік.** А ў мяне твае дзелавыя сустрэчы…
**Воля.** Такі моцны жах, як у канапы, якую ты паліў.
**Толік.** А ў мяне твой Вадзім Пятровіч…
**Воля.** Я не змагу табе паверыць яшчэ раз.
**Толік.** А я змагу?
**Воля.** Павер мне, як індыйскай актрысе.
**Толік.** За нас! *(Падымае келіх).*
**Воля.** Не магу.

**Сцэна 2**

**Хлопчык.** Вы мяне падманулі.
**Мама.** Што такое?
**Хлопчык.** Вы сказалі, калі мяне пахлысцяць, я длугім чалавекам стану.
**Мама.** Правільна.
**Хлопчык.** А я як літалу «л» не вымаўляў, так і не вымаўляю.
**Мама.** Падрасцеш і вымавіш. У мяне такое таксама было.
**Хлопчык.** І Воля, як на мяне не звялтала ўвагі, так і не звялтае.
**Мама.** І гэта бывае. А бывае і горш. Разумееш, дзяўчынкі – яны такія… складаныя. Яны то хочуць, каб на іх звярталі ўвагу, а пасля раптам іх раздражняе, што на іх шмат увагі звяртаюць. І заўсёды трэба быць напагатове. Гэта вельмі адказна.
**Хлопчык.** Добла быць дзяўчынкай: ніякай увагі, ніякай табе адказнасці.
**Мама.** Увагу яны праяўляюць. Толькі не так. Іх каханне адчуваць трэба.
**Хлопчык.** Гэта як ты тату завалываеш галбату, а пасля сплабуеш – смачная яна ці не?
**Мама.** Так, гэта мая ўвага.
**Хлопчык.** І гэта каханне?
**Мама.** Каханне.
**Хлопчык.** Мне тады не клыўдзіцца на яе?
**Мама.** Не. На цябе ж наша Джэсі не крыўдзіцца, калі ты ўвесь дзень гуляеш без яе. Ты вяртаешся, а яна ліжа табе твар.
**Хлопчык.** І Воля, мабыць, сумуе зараз па мне?
**Мама.** Мабыць, сумуе, але сказаць уголас нічога не можа.
**Хлопчык.** І я сказаць уголас чамусьці не магу.

**Мама.** Будзеце маўчаць і надзімацца адно на аднаго?
**Хлопчык.** Магу і наклычаць.
**Мама.** Лепш прабачыць і аблізаць увесь твар.

## Сцэна 12

*Шум цягніка. Толік чытае газету.*

**Воля** (*набірае нумар далькажыка).* Ало. Аўтасэрвіс? Ало.
**Толік** (*перадражнівае).* Ало.
**Воля.** Гэта аўтасэрвіс?
**Толік.** Так, аўтасэрвіс.
**Воля.** Аўтасэрвіс…
**Толік.** Кажу «так».
**Воля.** Ало, ало…
**Толік.** Так, так…
**Воля.** Ало.
**Толік.** Ало.
**Воля.** Аўтасэрвіс?
**Толік.** Аўтасэрвіс, аўтасэрвіс…
**Воля.** Тут што, няма сувязі?
**Голас бабулькі.** Якой яшчэ сувязі?
**Воля.** Ясна. Паглядзелі домік! Тваю мамачку ды ў правае вочка! Усё! Няма сувязі тут! Не. Цяпер я не паспею, і ляснуцца мае ўклады…
**Толік.** Божа ты мой, а я напалохаўся. «Верка Сярдзючка зрабіла пластычную аперацыю…»
**Воля.** Ага! Ты напалохаешся. Як жа! Напалохаешся.
**Толік**. Але ж не за твае справы мне баяцца. «Я – робат», – сказала жонка мужу пасля дзесяці гадоў шлюбу…».
**Воля.** Вядома! Гэта ж мае справы! Гэта мой бізнес.
**Толік.** «Стаматалагічныя паслугі…».
**Воля.** А просты тэлефон у вас ёсць?
**Толік.** «Зняцце нагавору…».
**Голас бабулькі.** А ў мяне і электрычнасці няма.
**Воля.** Яшчэ лепш. Домік хацелі купіць.
**Толік.** «Лячэнне атлусцення, карэкцыя грудзей…».
**Голас бабулькі.** А што такога? Чым ён горшы без электрычнасці?
**Толік.** «Вядомая спявачка знайшла лёс па картах таро…».
**Воля.** Нават тэлевізар не паглядзіш.
**Толік.** «13.00. Навіны…».

*Воля хоча забраць газету ў Толіка, пачынаецца тузаніна.*

**Голас бабулькі.** А нашто яго глядзець? Вы, лепей, па вечарах адзін аднаму ў вочы глядзіце. Там вы пра ўсе важныя для сябе навіны даведаецеся і самыя цікавыя фільмы пабачыце. *(З'яўляецца).*
**Толік.** Колькі за домік, бабуля, хочаце?
**Бабулька.** Дванаццаць тысяч…
**Толік.** Супер!
**Бабулька.** … еўра.
**Толік**. Бярэм!
**Воля.** За што?
**Бабулька.** За натуральнае дрэва…
**Толік.** За натуральнае дрэва!
**Бабулька.** …чыстае паветра…
**Толік.** За чыстае паветра!
**Бабулька**. … аддаленасць ад людзей…
**Толік.** … адсутнасць электрычнасці, вады…
**Бабулька.** … і сувязі…
**Толік.** Сувязь адсутнічае!
**Бабулька.** … і за мае цудоўныя ўспаміны.
**Воля.** Сапраўды…
**Толік.** Цудоўныя!
**Бабулька.** Вось і набралася дванаццаць тысяч.
**Воля.** А ў еўра чаму?
**Бабулька.** Дык інфляцыя!
**Толік.** Інфляцыя!
**Воля.** Інфляцыя…
**Бабулька.** А я хачу падалей адсюль з'ехаць. На мора. Каб цела маё нямоцнае соль марскую ў сябе ўвабрала, каб на тым свеце я мужу пра мора распавядала б, і ён бы пах мора адчуў, і кахаў бы мяне і кахаў яшчэ мацней…
**Толік.** Вось. А ты не хочаш са мной на рыбалку ездзіць, каб увабраць у сябе пах…
**Воля.** Рыбы?
**Толік.** Чаму рыбы? Ракі, белых гарлачыкаў, мятліцы…
**Воля.** Ху-гаў-пі-дрын-dратліцы! А не мятліцы.

*Шум цягніка.*

**Толік.** А тут рэчка ёсць?

**Бабулька.** Ёсць.
**Толік.** Якая?
**Бабулька.** Атамная!
**Толік.** Рыба?
**Бабулька.** Вось такія касякі!
**Толік.** Фантастыка!
**Бабулька.** Пятнаццаць.
**Толік.** Што пятнаццаць?
**Бабулька.** Пятнаццаць тысяч еўра.
**Толік.** Фантастыка.
**Воля.** Крутыя, бабуля, апетыты. Большыя, чым у падатковай.
**Бабуля.** За шчасце пераплаціць не шкада.
**Воля.** Шчасце без электрычнасці. І як вы так усе дакладна падлічылі?
**Бабулька.** А што? Я, па-вашаму, здзічэлая бабка сярэднееўрапейская, занесеная ў Чырвоную кнігу? Раз у тыдзень да суседзяў хаджу. Напрасткі пяць кіламетраў. За тыдзень мы так ссумуемся, што пра ўсё пагаворым, вып'ем, пра ўсе эканамічныя справы даведаемся. Вось я і вырашыла ў сувязі з усеагульнай інфляцыяй выставіць на продаж домік з садова – паркавым краявідам за… пятнаццаць тысяч.
**Воля.** Тут яшчэ і краявід ёсць?
**Толік.** Садова – паркавы.
**Бабулька.** Так. Застаньцеся на адну ноч. Раніцой я вас пабуджу, і вы голенькія ў тумане па расе, па краявіду да рэчкі – гоп туды! І зразумееце, наколькі вы сэканомілі са мной.
**Толік.** Ну як?
**Воля.** Я ніяк.
**Бабулька.** Заставайцеся. Ужо вечарэ.
**Воля.** Я не прывыкла рана класціся спаць.
**Бабулька.** Правільна. І не трэба спаць! Ты мужа кахай.
**Воля**. Дзякуй.
**Толік**. Самі разбярэмся.
**Воля.** Ты ўжо разбярэшся. Ужо два гады разабрацца не можам.
**Бабулька**. Вось у мяне і разбярэцеся. Да світання часу хопіць.
**Толік.** Сумняваюся. А наколькі тут усё чутна?
**Бабулька**. Вой, стагніце, колькі хочаце. Тут толькі цягнікі ідуць без прыпынку. Навакол – нікога.
**Толік.** А вы?
**Бабулька**. Я свая. Не звяртайце ўвагі. Мне, наадварот, лепш будзе спацца, сны прыемныя прыйдуць. Муж, можа, прысніцца.
**Воля.** Які жах. Я хачу назад.
**Толік.** Наперад! Колькі да станцыі бліжэйшай?

**Бабулька.** Даўно я туды не хадзіла. Апошні раз хвілін сорак ішла.
**Воля.** Ага! Дамок на прыродзе!
**Толік.** Ну, так, на прыродзе. Ты ж сама хацела падалей ад горада.
**Воля.** Але ж не сорак хвілін пешшу!
**Бабуля.** А што тут такога? Нейкіх там сорак хвілін усяго толькі!
**Воля.** Мне і фітнесу хапае.
**Бабуля.** Не зразумела.
**Воля.** Я ў спартыўнай зале бегам займаюся.
**Бабулька.** Якая зала? Тут бегайце! У вашыя гады я за дваццаць хвілін ад станцыі дабягала.
**Воля.** Трыста год! Дачакаецеся. А восеннню ў гразь? А ўзімку?
**Бабулька.** Яшчэ хутчэй бегла! Таму што ведала, што да каханага свайго бягу. І так лётала, так лётала! А ў хаце, ужо ён цёплы, гарачы, мяня абдымае і проста на падлогу кідае і грэе, грэе ў абдымках…
**Воля.** Бабуля, прашу вас.
**Бабулька.** Ты не мяне прасі, а мужа свайго.
**Воля.** Ды пайшоў ён.
**Толік.** Ужо пайшоў! *(Зыходзіць).*

*Шум цягніка.*

**Воля.** Як мне ўсё гэта…
**Бабулька**. Надакучыла?
**Воля**. Менавіта.
**Бабулька.** А ты грабі ўсё да кучы. Бо іншага не будзе.
**Воля.** Бачу, вы лепш за мяне разумееце што да чаго.
**Бабулька.** Лепш. Таму што паспявала ўсё. А галоўнае – кахаць паспявала. Працавала ў гародзе і там жа кахала. Працавала ў лесе і там жа кахала.
**Воля.** Бабуля, а вы хоць дзе-небудзь не кахалі?
**Бабуля**. На даху не кахала. Вышыні баюся. Спрабавалі з мужам адзін раз, але галава закружылася, ледзь не забілася. А так усюды. Хіба, што акрамя мора. Заўсёды хацелі паехаць, пабачыць гэтае шалёнае мора і палюбіць яго. Не выйшла…
**Воля.** Не выйшла…
**Бабулька.** А трэба.
**Воля.** Часам, здаецца, трэба, а часам – не трэба.
**Бабулька**. Як вас завуць?
**Воля.** Воля і, блін, Толя.
**Бабулька.** Самае страшнае, Воля, гэта вусны без пацалункаў.
**Воля.** Што?

**Бабулька.** Што?
**Воля.** Што вы зараз сказалі?
**Бабулька.** Я сказала, там цягнік з глухімі паехаў. Дык яны клікалі цябе з сабой. Махалі з вакна рукамі і крычалі: «Воляяяя!!!! Паехалі з намііііііі!!».
**Воля.** Я ведаю, што я кепская. Але што мне рабіць?
**Бабулька.** Забудзь, што ты гэта ведаеш. А не можаш забыць, дык напіся сёння і хоць раз стань поўнай дурніцай. Вось тады табе, Волечка, адкрыюцца сапраўдныя веды.
**Воля.** Во як!
**Бабулька.** Вось так. Зараз вячэру хуценька зраблю. Дапаможаш мне накрыць? Давай, давай. Рухайся! Не ў спартзал прыйшла.
**Воля.** А вас як завуць?
**Бабулька.** Як хочаш. Хоць бабкай.
**Воля.** Бабкай? Бабка… Бабка… Бабуля, а ён застанецца?
**Бабулька.** А куды ён падзенецца? Вооооой!!! Аааааай!!! Толік!!! Толік!!!

*Убягае Толік. Бабулька бярэ вядро і вылівае ваду на Волю і Толіка.*

**Бабулька.** Прабачце, даражэнькія. Для справы трэба. Народ і партыя вас не забудуць. Толькі не мерзніце. Піць будзем?
**Толік.** А што я? Не чалавек?
**Бабулька.** Зараз сагрэемся!

*Шум цягніка.*

## Сцэна 8

*Начны клуб перад закрыццём.*

**Афіцыянтка.** Ногі баляць.
**Стрыптызёр.** Гэта ў мяне ногі баляць. Танцаваў, як пракляты.
**Афіцыянтка.** А яшчэ ў мяне вушы баляць. І чакра.
**Стрыптызёр.** Слухай, супакойся. Наслухалася хворых.
**Афіцыянтка.** Яны не хворыя. Яны закаханыя.
**Стрыптызёр.** Ага, так крычаць могуць толькі закаханыя.
**Афіцыянтка.** Калі б я так кахала, у мяне б ад жарсці пломбы павылётвалі.
**Стрыптызёр.** А спакайней кахаць можна?

**Афыцыянтка.** Можа, і можна. Толькі не так цікава. Стрыптык, паехалі ў Кемерава. Там дзяздзька. Вадзім Пятровіч.
**Стрыптызёр.** Не хачу я дзядзьку. І ў Кемерава не хачу.
**Афіцыянтка.** Якая розніца, дзе свой пецечэк паказваць?
**Стрыптызёр**. Ты што? Там Сібір.
**Афіцыянтка**. Хто-небудзь адагрэе.
**Стрыптызёр.** Гэта табе адагрэцца трэба. І прагрэць вушы, якія даўно не лашчылі, і цела, якое даўно не абдымалі...
**Афіцыянтка.** І шчокі без эмоцый...
**Стрыптызёр.** І рукі без поціску...
**Афіцыянтка.** І чакры без адкрыццяў! (*Смяецца).* Стрыптык, а я пярсцёнак абручальны знайшла. Мне не падыходзіць. Давай табе памерыем. На гэты не лезе. І на гэты не лезе. Якія ў цябе да здзіўлення кранальныя пальчыкі. Я б іх усе адкусіла.
**Стрыптызёр.** Но! Но!
**Афіцыянтка.** Кожны па аднаму. Дзесяць на руках, дзесяць на нагах. Адкусіла і трымала б у роце, як ледзяшы. І ні з кім бы не дзялілася, пакуль бы яны не расталі. Як табе?
**Стрыптызёр.** Вазьмі адпачынак. З’ездзі ў Кемерава. Па дарозе наведай Тальяцці, Чэбаксары...
**Афіцыянтка.** Патрэбны мне твае караўкі! Глянь, пярсцёнак падыйшоў. Гэта лёс.
**Стрыптызёр.** Яшчэ скажы - карма.
**Афіцыянтка.** Ну што, чайка акальцаваная, насі цяпер на шчасце.
**Стрыптызёр.** Ці прынясе яно шчасце?
**Афіцыянтка.** Я, як прафесар-арнітолаг, думаю, што так.
**Стрыптызёр.** А раптам гэты пярсцёнак той сямейнай парачкі?
**Афіцыянтка.** Ай. Нічога. Прыкмета такая: пярсцёнка няма – і птушачкі няма. Іх каханне ўжо далёка, у нірване. *(Смяецца).*
**Стрыптызёр.** Думаеш, у іх ужо ўсё?
**Афіцыянтка.** Усё, усё.
**Стрыптызёр**. Не паміраццa?
**Афіцыянтка.** Давай паспрачаемся! Калі за пярсцёнкам вярнуцца, я прайграла.
**Стрыптызёр.** І ў Сібір!
**Афіцыянтка.** Калі не прыйдуць, то ты са мной ажэнішся. *(Смяецца).* Ты падобны на коніка, якому адарвалі лапку.
**Стрыптызёр.** Хутчэй бы яны вярнуліся і памірыліся.
**Афіцыянтка.** Не прыйдуць! Не прыйдуць! Ім пярсцёнкі ўжо не патрэбны.

**Стрыптызёр.** Дробязь якая. Пярсцёнак! Галоўнае ж тое, што яны ёсць у адзін у аднаго. Побач. Жывыя, здаровыя, маладыя, прыгожыя, шумныя...
**Афіцыянтка.** Воой, воой.
**Стрыптызёр.** А астатняе ўсё… Гэтыя пярсцёнкі, канапы, карыны-марыны – усё гэта…
**Афіцыянтка.** …такая фігня.

**Сцэна 14**

*За сталом.*

**Бабулька.** Вой, Талян. Няправільна ты п'еш.
**Толік.** Заўсёды правільна піў, а зараз раптам няправільна.
**Бабулька.** Калі вакол цябе дамы – так не п'юць. Зараз навучу, як муж мой піў. Давай! Кілішак у рот закідай, але не выпівай. Цяпер грэеш, грэеш, саграваеш. Тааак! А затым так гэтым смакам увесь насычаешся і перадаеш гэту радасць сваёй сяброўцы ў вусны яе сухія. Перадавай, перадавай. Воля, давай – не сумуй! Падстаўляй свае вусны залатыя. Напой цёплы прымаеш, радасць адчуваеш і нам яе перадаеш гукам «Мммм»!
**Воля.** Ммммммм! Мммммм!
**Бабулька.** А цяпер палавінку выпіваеш, а другую мужу вяртаеш. А цяпер генеральная рэпетыцыя. Яшчэ раз, Талян, паўстакана наліваеш, у сябе ўліваеш. Смачна табе?
**Толік.** Ммммм!
**Бабулька.** Яшчэ б! Сама гатавала на травах. Усе травы каля плота, разгайданага каханнем, растуць. Так што, Воля, май на ўвазе.
**Воля.** Зразумела, бабка.
**Бабулька.** Дык смачна табе, кажаш?
**Толік.** Мммммм!
**Бабулька.** А сяброўка зацікаўлена глядзіць на цябе… Волька, бляха! Зацікаўлена, кажу. Вось так. Сяброўка глядзіць на цябе і хвалюецца: ці падзелішся ты сваім шчасцем з ёй. Хвалюйся, давай!
**Толік.** Мммм, ммм, ммм, ммм, ммм.
**Бабулька.** Чаго? Шчасцем дзяліся. Вось так улівай у яе вусны вільготныя, якія чакаюць. Волечка, смачна табе?
**Воля.** Мммммммммм…
**Бабулька**. Выдатна. Падзяліся цяпер палавінкай радасці сваёй...
**Толік.** Мне падабаецца.

**Воля.** Мне таксама.
**Бабулька.** Ага. Падабаецца? Ноччу будзе лепш! Усё! Прэм'ера! Цэлы стакан наліваем, выпіваем…

*Шум цягніка.*

## Сцэна 4

**Дзяўчынка.** У цябе майка новая?
**Хлопчык.** Новая.
**Дзяўчынка.** Прыгожая.
**Хлопчык.** Праўда?
**Дзяўчынка.** Так. Што ты сказаў?
**Хлопчык.** Праўда.
**Дзяўчынка.** Вой. Яшчэ раз паўтары.
**Хлопчык.** Прррррраўда. Пррраўда. Прррраўда.
**Дзяўчынка.** Ты памяняўся.
**Хлопчык.** І ў цябе новы пах.
**Дзяўчынка.** А ў цябе новая майка.
**Хлопчык.** Што яшчэ?
**Дзяўчынка.** Ужо нічога. Літару «р» навучыўся прамаўляць, а перрршым нічога сказаць не можаш.
**Хлопчык.** Дуррррррань.
**Дзяўчынка.** Які ты смешны.
**Хлопчык.** Рррраней не быў?
**Дзяўчынка.** Рррраней быў яшчэ больш смешным.
**Хлопчык.** А старрым я буду смешным?
**Дзяўчынка.** Старррым? Не ведаю. Дажыць яшчэ трэба.
**Хлопчык.** А кахаць мяне старррым будуць?
**Дзяўчынка.** Я бачыла старэнькіх, якія цалавалі адно аднаго перад сном, а яны ж так доўга ўжо разам гуляюць.
**Хлопчык.** І не нудна ім гуляць.
**Дзяўчынка.** У іх каханне.
**Хлопчык.** Вой, гэта каханне! Заўсёды вы, дзяўчынкі, пра каханне.
**Дзяўчынка.** У слове «каханне» няма літары «р».
**Хлопчык.** Вось і добра.
**Дзяўчынка.** Вось і кепска. Ты і без «р» мне падабаешся.

## Сцэна 16

*У ложку.*

**Воля**. Як галава кружыцца!
**Толік.** І ў мяне.
**Воля**.А ў мяня хутка кружыцца.
**Толік.** Вельмі хутка?
**Воля**. Так.
**Толік.** А што ты, як у першым класе адказваеш. Не можаш поўным сказам? Вельмі хутка кружыцца галава?
**Воля.** Так. Хутка, як кружэлка. Спыні яе.
**Толік.** Трымаю.
**Воля**. Не спыняецца.

*Шум цягніка.*

**Толік.** Рэйкі, рэйкі, шпалы, шпалы...
**Воля**. Козытна.
**Толік.** Цягнічок наш едзе п'яны...
**Воля**. Кінь.
**Толік.** Рэйкі, рэйкі...
**Воля**. Вой. А што гэта за шпала?
**Толік.** Гэта шлагбаум падняўся.
**Воля**. Падняўся? Шлагбаум?
**Толік.** Угу.
**Воля**. І што?
**Толік.** Што?
**Воля**. Смачна табе?
**Толік.** Ммм...
**Воля**. Ммм...

*Шум цягніка.*

## Сцэна 15

*Ноч. Усе спяць, акрамя музыкаў, якія рэпетуюць Адана.*

**Прадзюсер.** Бабульцы сніліся толькі далёкія моры і дзюгоні, якія не выходзілі на бераг. Быццам кацяняты, марскія каровы дурэлі на змярканні, і яна любіла іх так жа, як і мужа. Але муж ёй ніколі не сніўся... Марскія каровы бестурботна дурэлі ў вадзе. Да іх падплывалі

марскія канькі, і ўсе гуллівай сям'ёй здзіўлена глядзелі на сваіх суседзяў. А з каралавых рыфаў час ад часу з'яўляліся марскія козы. Бабулька не ведала, у якіх падводных калгасах жывуць гэтыя цудоўныя марскія жывёлы. Але ў сне яны былі падобны на самых звычайных зямных коз.

## Сцэна 17

*Першы крык пеўня.*

**Бабулька.** Добрага ранку, залаты. Выбачай, што так рана. Пабудзіла цябе? Выспацца мы яшчэ паспеем. Я адчуваю, што ў нас сёння будзе цудоўны дзень. Паслухай мяне. Морамі на Месяцы называюць цёмныя гладкія вобласці. Спачатку астраномы думалі, што на месцы такіх вобласцяў могуць быць акіяны. Адным з самых ашаламляльных у сваёй масштабнасці месяцовых мораў – з'яўляецца Усходняе. Яно знаходзіцца на самым краі бачнага месяцовага дыска, і таму, на жаль, яго цяжка назіраць з нашай планеты. Табе падабаецца месяцовае мора? Мне таксама. Яно далёка, яго не бачна. І адсюль нас на месяцовым моры таксама не будзе бачна, і нам ніхто не будзе замінаць, і нам не будзе сорамна старымі і голымі купацца ў моры… А цяпер культурная праграма. Магчыма, апошняя. Ну дык, сёння балет. У першы і апошні раз. Адольф Адан «Жызэль». Пачынаем.

*Музыкі граюць Адана ў нефармальнай аранжыроўцы.*

**Бабулька.** «Ноч. Вясковыя могілкі на беразе возера. Чутны таямнічыя гукі, загараюцца балотныя агні. У месяцовым святле вырастае цень уладаркі віліс. Узмахам рукі яна выклікае цень Жызэлі…».

*Бабулька сціпла танцуе.*
*Другі крык пеўня.*
*Шум цягніка.*

## Сцэна 18

*Шум цягніка.*

**Воля.** Так і не выспаліся.

**Толік.** Зараз бабка прыйдзе.
**Воля.** І здагадаецца, што мы асабліва і не спалі.
**Толік.** Можа, яна і так усё чула?
**Воля.** Можа.
**Толік.** Яна прывычная.
**Воля.** Нам патрэбны гэты дамок?
**Толік.** Як скажаш.
**Бабулька.** Рота, пад'ём!!!
**Воля.** Божа.
**Бабулька.** Што снілася на новым месцы?
**Воля.** Не здагадаецеся.
**Бабулька**. Няўжо?
**Толік.** А што табе і сапраўды прыснілася?
**Воля.** Мне прыснілася... Мне прыснілася новае жыццё.
**Толік.** Не зразумеў.
**Воля.** Ува мне новае жыццё.
**Бабулька.** Цяпер зразумеў?
**Толік.** Цяпер зразумеў.

*Цалуюцца.*

**Бабулька.** Васемнаццаць.
**Толік.** Што «васемнаццаць»?
**Бабулька**. Тысяч. Еўра. За дамок.
**Воля.** Гэта чаму?
**Бабулька.** Учора вас было двое. А цяпер ужо трое.
**Воля.** І што?
**Бабулька.** І тое! Інфляцыя. Цана павысілася.
**Воля.** Але ж не настолькі!
**Бабулька.** Настолькі, настолькі. І паверце: гэта выгадная прапанова.
**Толік.** Вядома выгадная.
**Бабулька**. Калі ваш дзіцёнак падрасце і спытае, як ён з'явіўся на свет, вы успомніце пра гэты дамок і зразумееце, што гатовы яго купіць за любыя грошы. Але тады я скажу цану – дваццаць альбо дваццаць пяць.
**Воля.** Давай купім, пакуль у нас другі дзіцёнак не з'явіўся.
**Толік.** А як жа твае грашовыя ўклады ў фірму?
**Воля.** Укладзем пасля. Як з дэкрэта выйду.
**Толік.** Добра.
**Бабулька**. Вось і згода.

**Толік.** Бабка, збірай свае рэчы. Мы цябе адвязем проста да натарыуса, потым у аэрапорт, пасадзім на самалёт, і ляці ты, бабуля наша цудоўная, на самае лепшае ў свеце мора.
**Воля.** Мы вам, бабуля, адрас свой пакінем. Прышліце нам потым паштоўку, каб мы дакладна ведалі, куда нам ніколі ў жыцці ехаць не трэба.
**Бабулька.** Абавязкова прышлю. На гэтае мора вам дакладна ехаць не трэба… А зараз хутка голенькімі па расе і на рэчку! Наперад!
**Толік.** Пабеглі?
**Воля.** А голай прыстойна?
**Толік.** Табе прыстойна. Пабеглі!
**Воля.** Хто апошні, той і дурань! *(Уцякае).*
**Толік.** Я дурань! Дурань! Які ж я дурань! *(Уцякае).*
**Бабулька.** Сварыцеся! Грамчэй сварыцеся! Яшчэ! Яшчэ. А мы вам пазайздросцім…

*Шум доўгага-доўгага таварняка.*

Пераклад з рускай мовы Мюра Фарыдовіча

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год